СЯБРОЎСТВА ЎДВОЙВАЕ РАДАСЦІ

Прысвячаецца Міжнароднаму дню дружбы — 30 чэрвеня



ПА ГАРЫЗАНТАЛІ: 2. Кола, асяроддзе сяброў *(разм.)*. 5. Пацалунак. 7. Былі б ..., будуць і скокі *(прык.)*. 9. ... мацней каменных сцен *(прык.)*. 10. У старажытнасці металічныя даспехі, браня. 11. Дзе ... і згода, там і двор прыгожы *(прык.)*. 12. Стары сябры і старое ... лепш за ўсё *(прык.)*. 13. Куча сухога галля. 14. Нахіл набок самалёта, судна. 17. Лісцевае дрэва. 19. Адзін ... ці сто коп — хлеба на год *(прык.)*. 20. Добра, калі сабака — ..., але дрэнна, калі ... — сабака *(прык.)*. 23. ... свеціць праз дождж — да перамены надвор'я *(прыкм.)*. 24. Хітры, як ліса, а баязлівы, як ... *(прык.)*. 25. Спрабуй ... агнём, а сябра — грашыма *(прык.)*. 26. Тэатралізаванае выступленне. 27. Механізм для замыкання і размыкання электрычнага ланцуга. 28. Дружба ўдвойвае ... і скарачае напалавіну няшчасці *(прык.)*.

ПА ВЕРТЫКАЛІ: 1. Той, хто займаецца спелеалогіяй. 2. Адзін з музычных гукаў. 3. Паэт і музыкант, выканаўца ўласных песень. 4. «Весялосць — гэта ..., пад якім квітнее ўсё, акрамя злосці». Ж. Поль. 5. ... без друга, што яда без солі *(прык.)*. 6. Ніжняя частка адзежыны. 8. «Ты, ... дарагая, // Пойдзем паабедаем. // Аднаго мілёнка любім — // Пойдзем пераведаем» *(Прыпеўка)*. 15. Ранішні спектакль. 16. «Кепскі друг — што цень: у сонечны дзень не адчэпішся, а ў ... не знойдзеш». Цытата невядомага аўтара. 18. Не ... — друг, а друг — ... *(прык.)*. 20. Абход для агляду. 21. Не карай, ..., нічым, як другам ліхім *(прык.)*. 22. Тое, што і штабель. 26. 16-я літара грэчаскага алфавіта.

Склаў Лявон ЦЕЛЕШ,
г. Дзяржынск.

ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Па гарызанталі: 2. Сябрына. 5. Чмок. 7. Песні. 9. Дружба. 10. Латы. 11. Любоў. 12. Віно. 13. Лоўж. 14. Крэн. 17. Граб. 19. Сноп. 20. Друг. 23. Сонца. 24. Заяц. 25. Золата. 26. Паказ. 27. Рэле. 28. Радасці. **Па вертыкалі:** 1. Спелеолаг. 2. Сі. 3. Бард. 4. Неба. 5. Чалавек. 6. Крысо. 8. Сяброўка. 15. Ранішнік. 16. Непагадзь. 18. Багацце. 20. Дазор. 21. Божа. 22. Стос. 26. Пі.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	4.40	21.45	17.05
Віцебск —	4.22	21.43	17.21
Магілёў —	4.30	21.35	17.05
Гомель —	4.37	21.23	16.46
Гродна —	4.57	21.59	17.02
Брэст —	5.08	21.50	16.42

Месяц

Поўня 28 чэрвеня.
Месяц у сузор'і Казярога.

Імяніны

Пр. *Майсея, Міхаіла, Пятра, Ціхана.*
К. *ДЗЕНЬ СВ. АПОСТАЛАЎ ПЯТРА І ПАЎЛА. Саламеі, Францішка.*

Фота Максіма ШАСТАКОВА.

ЗАЎТРА



Даты | Падзеі | Людзі

29 ЧЭРВЕНЯ

1889 год — нарадзіўся Павел Шастакоў, беларускі дзяржаўны дзеяч, журналіст, публіцыст.

1896 год — нарадзіўся Пётр Крук, заслужаны артыст Беларусі.

1913 год — нарадзіўся Пётр Рудзік, заслужаны архітэктар Беларусі. Аўтар серыі тыпавых праектаў жылых дамоў, клубаў, дзіцячых дашкольных устаноў. Найбольш значныя працы: забудова цэнтральных сядзіб калгасаў «Прагрэс», «Гвардыя» Гродзенскага раёна, імя Леніна Брэсцкага раёна.

1925 год — нарадзіўся Юрый Астроўскі, беларускі біяхімік.

1934 год — утвораны Мінскі раён.

1938 год — нарадзіўся Пётр Чыгрынаў (вёска Вялікі Бор Касцюковіцкага раёна), беларускі навуковец, доктар гістарычных навук. Аўтар даследаванняў па праблемах патрыятычнага выхавання, фарміравання дзяржаўнага суверэнітэту і дэмакратызацыі палітычнай сістэмы ў сучасных умовах.

1613 год — ад агню гарматы падчас прадстаўлення п'есы «Генрых VIII» у Лондане згарэлі драўляны будынак тэатра «Глобус» і архіў, дзе знаходзіліся рукапісы вялікага англійскага драматурга Уільяма Шэкспіра. У 1997 годзе тэатр быў адноўлены ў стылізаваным выглядзе на ранейшым месцы ў лонданскім раёне Саўсуорк.

1798 год — нарадзіўся Джакама Леапардзі, італьянскі рамантычны паэт, мысліцель-мараліст.

1888 год — нарадзіўся Уладзімір Вятчынкін, расійскі вучоны ў галіне аэрадынамікі, паветраплавання і ветравой энергіі, доктар тэхнічных навук, заслужаны дзеяч навукі і тэхнікі РСФСР.

1900 год — нарадзіўся Антуан дэ Сент-Экзюпеоры, французскі пісьменнік, філосаф.

1908 год — нарадзіўся Лерой Андэрсан, амерыканскі кампазітар. Аўтар арыгінальных музычных мініяцюр і аранжыровак, такіх як «П'еса для пішучай машынкі з аркестрам», «Сінкапіруючы гадзіннік», «Кот, які вальсуе», «Катанне на санках», «Дробязь» .

1913 год — пачалася Другая балканская вайна — ваенныя дзеянні Балгарыі супраць Грэцыі, Сербіі і Чарнагорыі, да якіх далучыліся Румынія і Асманская імперыя. Завяршылася паражэннем Балгарыі, паўплывала на расстаноўку сіл на Балканскім паўвостраве, паскорыла пачатак Першай сусветнай вайны.

1922 год — Расію назаўсёды пакінуў спявак Фёдар Шаляпін.

1973 год — канцэрт гурта Deep Purple ў Осацы (Японія) стаў іх апошнім выступленнем у класічным складзе пачатку 1970-х. Ян Гілан і Роджэр Гловер зноў злучыліся з сябрамі толькі ў 1984 годзе.

УСМІХНЕМСЯ

«Мы вельмі спазняемся і павінны пасяшацца, нас даўно чакаюць. Давай, хуценька апранайся, а я ўмомант», — сказала мне жонка і пайшла ў ванную фарбаваць валасы...

Інструкцыя па пазбаўленні ад гневу:
1. Заплюшчыце вочы.
2. Зрабіце глыбокі ўдых і выдых.
3. Адкрыйце адно вока.
4. Страляйце.

Жонка алігарха распякае маладзенькую хатнюю прыслужніцу:

— Што, Маня, дагулялася? Я бачу, ты цяжарная!

— Ну і што? Вы ж таксама...

— Як ты можаш параўноўваць?! Я цяжарная ад свайго мужа, а ты?

— Дык і я ад яго...

Мы ўчора на шашлыкі ездзілі. Але грошай на мяса не было. Таму ўзялі толькі гарэлку.

caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 2351.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 28 чэрвеня 2018 года.